**Карповіч Наталля Валяр'янаўна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ І ПРАВАСЛАЎНАЕ ДУХАВЕНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

У пачатку XX ст. беларускі нацыянальны рух прыняў свядомы характар. Шырокія колы грамадскасці прынялі ў ім актыўны ўдзел, нават такая кансерватыўная група насельніцтва як праваслаўнае духавенства пастурова далучылася да яго. Сярод айчынных аўтараў асобныя аспекты ўдзелу праваслаўнага духавенства ў справах беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння разглядае В. В. Яноўская, яго палітычную актыўнасць пад час рэвалюцыі 1905–1907 гг. даследуе У. С. Пуцік і інш [4,2]. Але фарміраванне і эвалюцыя палітычных поглядаў праваслаўнага духавенства, удзел яго у нацыянальным руху патрабуе больш дэталёвага вывучэння.

У пачатку XX ст. найбольш ўплывовым веравызнаннем на тэрыторыі Расійскай імперыі заставалася праваслаўная царква. Яе стан і дзейнасць у Заходнім краі і ва ўнутраных рэгіёнах імперыі вельмі адрозніваліся. Асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг. палітыка царскага ўраду на тэрыторыі Беларусі прыняла жорсткую накіраванасць на зацвярджэнне тут рускіх дзяржаўных асноў. Ажыццяўлялася яна пад сцягам «заходнерускага адраджэння». «Заходнярусы» шукалі сябе падтрымку ў асяроддзі мясцовай інтэлігенцыі. Так, М. Каяловіч прапанаваў абапірацца ў грамадскіх справах на праваслаўнае духавенства: «духавенства ...ёсць самая надзейная крыніца народнай інтэлігентнай сілы, а беларускія паповічы – самая надзейная апора для правільнага развіцця Беларусі ў будучыні», – пісаў ён [3, с. 222]. Менавіта праваслаўнаму духавенству было даручана пераканаць беларусаў у тым, што іх родная зямля спрадвеку рускі край, а самі яны апалячаныя рускія, якіх зараз трэба вярнуць і да праваслаўнай царквы, і да рускай народнасці [2, с. 20]. Таксама ў мэтах паслаблення ў краі польскага ўплыву ўрад разлічваў на падтрымку праваслаўнага духавенства. У той жа час праваслаўнае духавенства было занепакоена тым, што ў выніку палітыкі русіфікацыі каталіцкія святары атрымаюць роўныя з імі правы.

Напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. у арганізацыйнай структуры і ідэйных прынцыпах праваслаўнай царквы назіраюцца крызісныя з'явы, адбываецца заняпад рэлігійнасці ў народзе, акрамя таго, адыход ад курсу мэтанакіраванай русіфікацыі, інфіцыраваны мясцовымі ўладамі, пашырыў магчымасці ксяндзоў у грамадскіх справах. Такім чынам, аслабленне сваіх сацыяльных функцый праваслаўнае духавенства імкнецца пераарыентаваць на грамадскую і палітычную актыўнасць. Пад час рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. праваслаўнае духавенства разам з іншымі сацыяльнымі групамі ўключаецца ў палітычнае жыццё краіны. Праваслаўнае духавенства Беларусі ў выбарчай кампаніі ў Дзяржаўную думу, як і ў цэлым у Расійскай імперыі, падтрымала правыя прадзяржаўныя арганізацыі. Але прадстаўнікі духавенства не прымалі прамога ўдзелу ў дзейнасці партый і аб'яднанняў, а забяспечвалі іх ідэалагічнае кіраўніцтва. Святары павінны былі быць пастырамі, пашыраць веды сярод насельніцтва пра сутнасць выбараў і іх ход, бо рэальнасць паказала, што духавенства

слаба валодае агітацыйнымі метадамі [1, с. 560]. Далейшая дзейнасць праваслаўнага духавенства на тэрыторыі Беларусі была скіравана на ўмацаванне ўрадавых пазіцый. Адначасова свяшчэннаслужыцелі прыцягваліся да збору гістарычных, этнаграфічных і археалагічных матэрыялаў. Імі ствараліся царкоўна-статыстычныя камітэты, якія, на падставе сабранага матэрыялу, складалі агляды епархій. Шматлікія святары з'яўляліся аўтарамі этнаграфічных артыкулаў, апублікаваных не толькі ў мясцовых але агульнарасійскіх выданнях. Акрамя таго, ў арганізацыі краязнаўчай дзейнасці прымалі актыўны ўдзел дапамагалі царкоўна-грамадскія аб'яднанні – праваслаўныя брацтвы. Яны ўтваралі ў межах губерняў царкоўна-археалагічныя камітэты, якія з мэтай вывучэння і апісання помнікаў царкоўнай даўніны і іх захавання арганізоўвалі экспедыцыі.

Ініцыятарам народнага беларускага адраджэння з'яўлялася рымска-каталіцкае духавенства. Значна ўвагі яны надавалі беларускай мове, на якой праводзілі богаслужэнні, даследавалі гісторыю і традыцыі беларусаў. Паступова асобным ксяндзам-беларусам удалося згуртавацца і прайсці шлях да стварэння арганізацыйнага руху і ўвайшлі ў склад «Хрысціянскай дэмакратычнай злучнасці» [4, с. 141]. Падзеі Першай сусветнай вайны аслабілі канфесійную канфрантацыю паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам, аб'ядналі іх у справах міласэрнасці і сацыяльнага служэння. Нягледзячы на той факт, што пад час рэвалюцыйных падзей 1917 г. для праваслаўнага духавенства найбольш актуальнымі былі пытанні вызначэння месца царквы ў новых дзяржаўных умовах і адмаўленне патрыяршаства, яно далучылася да беларускага нацыянальнага руху. У чэрвені 1917 г. ў Маскве праходзіў з'езд праваслаўнага духавенства, у якім прымалі ўдзел каля 700 святароў. Сярод ўдзельнікаў з'езда можна згадаць протаіерэя Мінскай епархіі Стэфана Кульчыцкага і протаіерэя Гродзенскай епархіі Іаана Карчынскга. Яны разам з іншымі ўдзельнікамі далучыліся да пастановы аб неабходнасці дабівацца аўтаноміі Беларусі ў федэратыўнай дэмакратычнай расійскай рэспубліцы і навучання ў школах па-беларуску.

Нягледзячы на тое, што праваслаўнае духавенства прытрымлівалася праўрадавых пазіцый у грамадска-палітычным жыцці Беларусі, нельга недаацэньваць яго ролі ў вывучэнні гісторыі і культуры беларускага краю. Неспрыяльныя палітычныя ўмовы не сталі перашкодай да фарміравання ў асяроддзі духавенства беларускай нацыянальнай ідэі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Минские епархиальные ведомости. – 1906. – № 20 (15 октября). – С. 560.
2. Пуцік У. С. Падзенне ролі праваслаўнай царквы ў сацыяльнай сферы і рост яе палітычнай актыўнасці ў Беларусі ў пачатку ХХ ст. // Весці БДПУ – 2006. – №4. – С. 19–22.
3. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
4. Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. / В.В.Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 199с.; іл.